Свята Святой Сям’і: Езуса, Марыі і Юзафа

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
26.12.2021 00:00



Лк 1, 39–45 Бацькі Ягоныя хадзілі штогод у Ерузалем на свята Пасхі. І калі Яму было дванаццаць гадоў, яны прыйшлі паводле звычаю ў Ерузалем на свята. Калі пасля заканчэння дзён свята яны вярталіся, засталося Дзіця Езус у Ерузалеме, і не заўважылі гэтага Ягоныя бацькі. Думаючы, што Ён ідзе з падарожнымі, прайшлі дзень дарогі і тады пачалі шукаць Яго між сваякамі і знаёмымі. Не знайшоўшы, вярнуліся ў Ерузалем, шукаючы Яго. І сталася, што пасля трох дзён знайшлі Яго ў святыні. Ён сядзеў сярод настаўнікаў, слухаючы іх і пытаючыся ў іх. Усе ж, хто слухаў Яго, дзівіліся розуму і адказам Ягоным. †

Сапраўдны фундамент

Свята Святой Сям’і – гэта дзень падзякі для кожнай сям’і. Вачамі душы мы павінны перанесціся ў Назарэт і ўвайсці ў дом Марыі і Юзафа. Там убачым іх любоў, узаемны клопат і павагу.

Як жа такая любоў сёння патрэбна нашым сем’ям і іх членам! Сямейнае жыццё, пабудаванае па ўзоры жыцця Марыі, Юзафа і Езуса, павінна быць жыццём любові – такой любові, якая гатова дараваць і прынесці ахвяру дзеля іншых. Просім, каб асновай нашых дамоў і сем’яў была Святая Сям’я.

Пане Езу Хрысце, учыні, каб мая сям’я была школай Евангелля, дзе кожны знаходзіць Цябе!